Мішуроў Г.С.,
прафесар

## НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАННЯ Ў АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАХ

Разглядаючы праблемы народна-інструментальнага выканання ў Беларусі, неабходна звярнуць увагу на тры асноўныя аспекты, якія непасрэдна звязаны з этнаграфічнымі асаблівасцямі фальклору, падрыхтоўкай кадраў і вырабам беларускіх народных інструментаў.

Можна сказаць, што яшчэ маладаследаванымі застаюцца формы папулярызацыі народнай мастацкай культуры прафесійнымі і самадзейнымі калектывамі. Маюцца на ўвазе дэманстрацыя на сцэне жывога бытавання фальклору, яго эстэтыка, ступень і крытэрыі апрацоўкі фальклору, эвалюцыя жанравага спектра, стварэнне традыцыйнага музычнага інструментарыя. Думаецца, што ў гэтай сувязі этнографам і фалькларыстам не трэба абмяжоўвацца толькі вывучэннем вытокаў жанравых сістэм, фальклорнай сюжэтнасцю, стварэннем і асаблівасцямі функцыяніравання народных уяўленняў, свят і абрадаў у тэарэтычным плане, а пажадана сканцэнтраваць сваю ўвагу на спецыфічных працэсах і практычнай дзейнасці аматарскіх калектываў народна-інструментальнага выканання Беларусі.

Калі на эстрадзе не ўлічваецца этнаграфічная асаблівасць фальклору выконваемага твора (асабліва жывога бытавання), то ён губляе сваю сутнасць, не набывае народнага прызнання і ўспрымаецца як стылізацыя. Толькі кожны ўдала адабраны элемент народнай эстэтыкі стварае непаўторны нацыянальны каларыт.

Праблемы падрыхтоўкі кіраўнікоў народна-інструментальных ансамбляў патрабуюць асаблівага даследавання. Таму, абмяжоўваючыся у данным выпадку агульным аглядам, лічым неабходным спыніцца толькі на пытаннях падрыхтоўкі і выхавання кадраў для разнастайных па складу чыста фальклорных (этнаграфічных) і трансфармаваных ансамбляў народных інструментаў Беларусі.

Вось чаму адна з асноўных задач універсітэта — падрыхтаваць не толькі прафесіянала-кіраўніка, але і перш за ўсё такога спецыяліста, які б беражліва захоўваў і працягваў прапагандаваць народныя традыцыі інструментальнага выканання. Аднак аналізуючы вытокі падрыхтоўкі кадраў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Беларусі, трэба заўважыць, што да гэтага часу, акрамя кафедраў народна-інструментальнай творчасці і харавых народных спеваў Беларускга універсітэта культуры, такога надобнага вопыту не было. Толькі за некаторым выключэннем у вучэбныя планы ўключаюцца дысцыпліны фальклорнага цыкла без выхаду на дзяржаўны экзамен і прысваення кваліфікацыі кіраўніка фальклорнага ансамбля.

Нам вядома, што традыцыйныя ансамблі, існуючыя ў Беларусі сярод выканальніцкіх калектываў, даволі разнастайныя па складу, аб чым сведчаць навуковыя даследаванні І.Назінай. Таму музычным навучальным установам пры падрыхтоўцы кадраў неабходна ўлічваць такія асаблівасці, і ў працэсе падрыхтоўкі інструменталістаў трэба ўкараніць практычную методыку, гэта значыць фарміраваць уменні працаваць з усімі відамі ансамбляў, якія здаўна існуюць сярод беларускага народа.

Поруч з інструментальным выкананнем немалаважная праблема пастаянна ўзнікае пры арганізацыі ансамбляў народных інструментаў не толькі ў навучальных установах, але і ў аматарскіх аб'яднаннях. Гэта забеспячэнне шматлікіх калектываў нацыянальнымі музычнымі інструментамі.

Таксама неабходна падкрэсліць, што спецыяльных майстэрняў па вырабу музычных нацыянальных інструментаў у Беларусі няма, а пакуль што абмяжоўваемся толькі вырабамі асобных майстроў прыватнай вытворчасці, чаго яўна недастаткова.

Таму выкладчыкі кафедры народна-інструментальнай творчасці глыбока вывучылі гэтае пытанне ра-зам з кіраўніцтвам Беларускага універсітэта культуры і выйшлі з прапановай у Міністэрства культуры і друку аб адкрыцці эксперыментальнай лабараторыі па вырабу ўсіх народных музычных інструментаў і навучанню студэнтаў гэтаму унікальнаму традыцыйнаму рамяству. Для ажыццяўлення функцыяніравання эксперыментальнай лабараторыі будуць запрошаны таленавітыя народныя умельцы, выкладчыкі кафедры народна-інструментальнай творчасці, кансультанты зарубежных фірмаў.

Народнае выкананне, безумоўна, адрозніваецца ад прафесійнага: мелодыя здаецца простай, музычны лад нейкім незвычайным (прастата гэта ўяўная). І папулярызацыя песеннага фальклору (звычайна і выкананне на нацыянальных інструментах) сярод беларускага народа ўяўляе часам пэўную цяжкасць. Дапамаг-чы справе можна шляхам шырокага прыцягнення моладзі ў фальклорныя ансамблі, выхавання яе на традыцыйных творах Беларусі.

Дранчук Н.П.,
выкладчык

## ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ АНСАМБЛЯЎ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ МУЗЫКІ

У той час, як у друку ставяцца пытанні аб праблемах выхавання моладзі, аб адраджэнні нацыянальнай самасвядомасці і культуры, энтузіясты знаходзяць шляхі іх вырашэння. Гэта стварэнне творчых наро-

дных музычных, тэатральных, танцавальных фальклорных згуртаванняў. Па ўсёй рэспубліцы амаль што стыхійна пракацілася хваля павелічэння цікавасці да танцавальнага, песеннага і інструментальнага фальклору, традыцый і абрадаў, нацыянальнага прыкладнога мастацтва. Калі раней калектывы народнай беларускай музыкі можна было пералічыць па пальцах, ды і выглядалі яны часцей як штучная мадэрнізацыя традыцый, то зараз з задавальненнем можна гаварыць аб паглыбленым вывучэнні нацыянальнай спадчыны, паглыбленым аналізе каранёў народнага мастацтва, аб вельмі адказных адносінах да вялікай задачы адраджэння нацыянальнай культуры нашай рэспублікі.

Стварэнне мноства творчых народных калектываў пацягнула за сабой праблему развіцця народнага ансамблевага выканання. Ніводная пастаноўка, спектакль, танцавальна-абрадавая кампазіцыя не абыходзяцца без музычнага суправаджэння. І калі за аснову творчай ідэі бярэцца нацыянальная народная тэматыка, гэтыя ж праблемы аўтаматычна пераносяцца і на музычнае ўвасабленне задумы мастака. Гаворка ідзе аб праблемах навуковага даследавання ўвасаблення і тэндэнцый развіцця самабытнага беларускага музычна-ансамблевага выканання.

Асаблівую ролю ў развіцці нацыянальнай культуры Беларусі павінна іграць станаўленне і развіццё музычна-ансамблевага выканання. Перш за ўсё гэта тычыцца ансамбляў беларускіх народных інструментаў. Працэс станаўлення і развіцця музычна-ансамблевай культуры вельмі складаны. Кіраўнік музычнага калектыву, асабліва ансамбля беларускай народнай музыкі, пастаянна сутыкаецца з цэлым радам праблем. Гэта праблемы рэпертуару, расшыфроўкі і апрацоўкі арыгінальных фальклорных музычных тэм, праблемы інструментоўкі, характэрнай для народнага самабытнага выканання, пытанні тэхнічныя і арганізацыйныя, авалоданне сакрэтамі выканальніцкага майстэрства ігры на старажытных інструментах, вывучэнне і папаўненне інструментарыя ансамбля арыгінальнымі новымі інструментамі, праблемы касцюмаў і інш.

Адным з найважнейшых напрамкаў нашай работы павінна быць падрыхтоўка прафесійна граматнага спецыяліста-кіраўніка ансамбля народнай музыкі. Задача заключаецца ў тым, каб навучыць яго, дапамагчы парадай, здолець накіраваць працэс работы будучага кіраўніка музычнага калектыву ў творчае рэчышча, развіць прыродныя здольнасці студэнта да ўзроўню прафесійна сталага спецыяліста, якому можна даверыць ў будучым такую важную справу, як адраджэнне самабытнай беларускай музычнай культуры. Таму накірунак работы ў класе ансамбля, ў класе спецінструмента павінен быць своеасаблівым. Гэта перш за ўсё паглыбленае вывучэнне лепшых узораў спадчыны беларускай народнай творчасці, фарміраванне ўмення самастойна знаходзіць цікавыя ўзоры народнай музычнай творчасці і уменне іх расшыфраваць, развіць і ўвасобіць у гучанні.

Рэдка бывае, калі студэнт здольны самастойна арганізаваць творчы калектыў. Таму з першых заняткаў трэба арыентаваць навучэнцаў на развіццё самастойнага аналізу творчага працэсу, умення вырашаць ўзнікаючыя ў рабоце як творчыя, так і арганізацыйныя пытанні. Гэта датычыцца і рэпертуару ў беларускіх народных музычных калектывах. Неабходна даць студэнту магчымасць адчуваць сябе цалкам кіраўніком музычнага калектыву, які адказвае за ўсе аспекты фарміравання і прафесійнай падрыхтоўкі гэтага калектыву. Як паказвае практыка, у выніку толькі такой работы мы атрымліваем спецыяліста, арганізатара і творчага кіраўніка ансамбля, які здольны працаваць на належным узроўні.

Глубачэнка В.М.,
ст.выкладчык

## МУЗЫЧНАЯ ІМПРАВІЗАЦЫЯ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ

Развіццё творчага патэнцыялу асобы -- адна з актуальных педагагічных задач. Пад творчым патэнцыялам мы разумеем сістэму здольнасцей і уласцівасцей асобы, якая дазваляе суб'екту дзейнасці ствараць новыя агульнакультурныя каштоўнасці і забяспечвае яму неабходную ступень свабоды самавыяўлення.

Імправізацыя -- адзін з відаў прадуктыўнай дзейнасці, які дазваляе творчаму патэнцыялу аасобы праяўляцца ва ўсёй сваёй паўнаце. Сучасная музычна-педагагічная тэорыя настойліва рэкамендуе ўключэнне заняткаў па імправізацыі ў навучальны працэс. Аднак практыка музычнага выхавання сведчыць аб тым, што падрыхтоўка спецыялістаў у шматлікіх навучальных установах, у тым ліку і ў вышэйшай школе, па-ранейшаму зводзіцца да авалодання пераважна выканальніцкімі ўменнямі і навыкамі.

Заняткі па імправізацыі садзейнічаюць фарміраванню музыканта, які арганічна спалучае ў сабе здольнасці да рэпрадуктыўнай дзейнасці. Вельмі спецыфічна ў імправізацыі праяўляюцца прадуктыўнае мысленне, інтуіцыя, ўяўленне і памяць -- здольнасці, якія з'яўляюцца аспоўнымі для ўсякай творчай дзейнасці.

Прадуктыўнае мысленне характарызуецца накіраванасцю суб'екта дзейнасці на стварэнне новага музычнага зместу, што выяўляецца праз новую гукавую канструкцыю. Гэта аднак не значыць, што музыкант павінен зусім адмовіцца ад музычна-вобразных уяўленняў і асацыяцый, якія маюцца ў яго вопыце. Наадварот, змест дзейнасці прадуктыўнага мыслення шмат у чым звязаны з выбрам, кампанаваннем формаўтвараючых элементаў, сродкаў музычнай выразнасці, а таксама выканальніцкіх прыёмаў, якімі ён валодае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ